**Водзыў**
**афіцыйнага апанента кандыдата гістарычных навук, прафесара Яноўскага Алега Антонавіча на дысертацыю Пышкала Кацярыны Рыгораўны "Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)", прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – "Айчынная гісторыя".**

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасцям і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.** Дысертацыя Пышкала Кацярыны Рыгораўны "Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)", прадстаўленая да абароны, з'яўляецца завершанай самастойнай навуковай працай і цалкам адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – "Айчынная гісторыя". Змест аўтарэферата цалкам адпавядае зместу дысертацыі.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Актуальнасць тэмы дысертацыі для айчыннай гістарыяграфіі тлумачыцца тым, што праблема вывучэння трансфармацыі сацыяльных інстытутаў, якія ў розныя гістарычныя перыяды з'яўляліся паказчыкам культурна-этычнага і гуманістычнага ўзроўню грамадства, а таксама паказчыкам сацыяльна-прававога і эканамічнага развіцця дзяржавы, і сёння мае відавочнае значэнне не толькі ў акадэмічна-навуковым рэчышчы, а перш за ўсё для далучэння даследчыцкіх высноў да асэсавання сучаснага стану палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства. Даследаванне дазваляе зразумець, як менавіта саслоўны прынцып падчас інтэграцыі беларускай тэрыторыі ў агульнаімперскі стан Расіі ўплываў на сацыяльную абарону дзяцей, выявіць эфектыўнасць саслоўных падыходаў і адпаведнай ім дзейнасці ў беларускіх губернях. Грамадская зацікаўленасць і навуковая значнасць праблематыкі вызначаюць як агульна акадэмічную, так і практычную актуальнасць тэмы даследавання. Разуменне гістарычных каранёў апекі дапамагае ў аналізе сучасных формаў сацыяльнай палітыкі і пераемнасці традыцый дабрачыннасці.

**Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, вынесеных на абарону.** Навізна атрыманых вынікаў забяспечана перш за ўсё выкарыстаннем тых падыходаў да ацэнкі аналізуемых падзей, што былі вызначаны мэтай і задачамі па яе дасягненню. Дысертант ставіў сваёй мэтай не толькі паказаць эвалюцыю юрыдычнага абгрунтавання галоўных складнікаў функцыянавання саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў 1772–1861 гг., а за кошт аналіза дакладных прыкладаў раскрыць спецыфіку гэтага працэса на тэрыторыі Беларусі, выявіць і навукова асэнсаваць характэрныя рысы ў практыцы ажыццяўлення апекі над сіротамі розных саслоўяў. Гэта запатрабавала пошук, верыфікацыю і аналіз значнай колькасці архіўных матэрыялаў. Прычым

матэрыялаў, можна сказаць, “дробных”, якія выяўлены ў розных фондах многіх архіваў. Менавіта зроблены ўпор на знаходжанне і сістэматызацыю такой крынічнай базы даў магчымасць саіскальніку вызначыць не толькі спецыфічныя формы апекі над сіротамі розных саслоўяў, а і паказаць іх асаблівасці, абумоўленыя шэрагам тых гістарычных фактараў, якія аказвалі ўплыў на агульны працэс сацыяльнага развіцця грамадства Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў у складзе Расійскай імперыі.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.** Навуковыя высновы, да якіх прыходзіць саіскальнік, пацвярджаюцца разнастайнай і змястоўнай базай крыніц (як архіўных, так і друкаваных). Так, выяўленне звестак, неабходных для дасягнення пастаўленай навуковай мэты, было праведзена ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі: з фондаў дваранскіх апек (693, 1463, 2072, 2073, 2074, 2076, 2549, 2616, 2659, 2801); сіроцкіх судоў (19, 2140, 2516, 3143); прыказаў грамадскай апекі (2638, 3348); губернскіх праўленняў (299, 3219); канцылярый грамадзянскіх губернатараў (295, 1430); канцылярый губернскіх прадвадзіцеляў дваранства (320, 2626); царкоўных інстанцый праваслаўнай канфесіі (136, 130, 2299); судовых інстанцый і гарадскіх устаноў (159, 145, 2620, 2647). Таксама былі выкарыстаны дакументы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна: дваранскіх апек (865, 1539); губернскіх праўленняў, судовых устаноў (2, 98, 586) і Брэсцкай уніяцкай кансісторыі (1621). Карысным у кантэксце тэмы дысертацыі стаў дакументальны матэрыял фондаў Расійскага дзяржаўнага архіва (1284, 1287).

Група заканадаўчых матэрыялаў прадстаўлена юрыдычнымі помнікамі прававых сістэм Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі. У працы выкарыстаны Статут ВКЛ 1588 г., заканадаўчыя крыніцы Расійскай імперыі. Даволі грунтоўна і карэктна прапрацаваны і ўведзены ў аналітычны і даказальны кантэкст як фактаграфічны, так і тэарэтычны матэрыял з прац папярэдніх даследчыкаў.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Навуковыя вынікі і публікацыі саіскальніка, атрыманныя і выдадзеныя ў ходзе працы над дысертацыяй, адпавядаюць прыярытэтным накірункам навуковых даследаванняў у галіне гуманітарных навук. Яны могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы спецыяльных і абагульняючых прац па гісторыі Беларусі для паказу і абгрунтавання ролі саслоўнага прынцыпа ў сацыяльнай абароне дзяцей падчас інтэграцыі беларускай тэрыторыі ў агульнаімперскі арганізм Расійскай дзяржаўнасці, яго ўлыву на замацаванне беларускага этнасу, сацыяльна-культурнага развіцця беларускага грамадства. Вынікі праведзенай саіскальнікам работы будуць карыснымі пры стварэнні вучэбных і метадычных дапаможнікаў для навучальных устаноў розных ступеняў і тыпаў. Вялікі масіў дакументаў, што былі ўведзены ў навуковы

зварот, можа паслужыць асновай для складання курса лекцый і правядзення семінараў па адпаведнай тэматыцы як гісторыі Беларусі, так і гісторыі Расіі, а таксама выкарыстаны пры складанні музейных экспазіцый и наглядных дапаможнікаў, арганізацыі школьных конкурсаў, навуковых гурткоў і факультатываў (аб чым сведчаць два акты ўкаранення вынікаў дысертацыі) .

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Асноўныя вынікі дадзенага дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 13 навуковых працах. Сярод іх 4 артыкулы ў часопісах і зборніках, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для публікацыі вынікаў даследаванняў, дасягнутых пры напісанні кандыдацкіх і доктарскіх дысертацыйных прац (агульны абъём складае 3,6 друк. арк.). Таксама вынікі даследавання змешчаны ў 9 іншых навуковых зборніках і матэрыялах канферэнцый (4,6 друк. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных прац складае 8,2 друк. арк.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Афармленне дысертацыі цалкам адпавядае патрабаванням ВАК. У дысертацыі прысутнічаюць неабходныя спасылкі на крыніцы інфармацыі. Яе структура абумоўлена мэтай і задачамі і складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, пяці глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, 3 дадаткаў на 7 старонках. Агульны аб'ём працы – 151 старонка (з іх тэкст даследавання складае 114 старонак). Бібліяграфічны спіс утрымлівае 311 пазіцый, а таксама 13 публікацый аўтара дысертацыі. Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыйнага даследавання, навуковым вынікам і палажэнням, якія вынесены на абарону, і напісаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК.

**Заўвагі і прапановы па дысертацыі.**

Выкарыстаны саіскальнікам корпус крыніц стварыў дастатковую навуковую аснову для вырашэння задач, пастаўленых у дысертацыі, рэпрэзентатыўнасці заключэнняў і навукова-абгрунтаваных высноў. Яны, у першую чаргу, вызначаны пры раскрыцці спецыфікі станаўлення саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.: у арганізацыі і практыцы апекі над дзецьмі-сіротамі дваранскага саслоўя; у саслоўнай апецы над дзецьмі-сіротамі гарадскіх і сельскіх абывацеляў, апецы над сіротамі духоўнага саслоўя. Гэтыя аспекты характарызуюцца гістарыяграфічнай навізной, даследаваны ўпершыню і ў дастатковай ступені грунтоўна.

Разам з тым, неабходна спыніцца на асобных момантах, якія, на думку апанента, патрабуюць звярнуць ўвагу саіскальніка пры дальнейшай працы над тэмай і магчымай падрыхтоўцы рукапісу да друку.

– Так, у адной з навуковых высноў, якія змешчаны ў "Заключэнні" дысертацыі (стар. 110), адзначаецца: *"У сілу спецыфікі канфесійнай палітыкі ў Расійскай імперыі, а таксама правіл веравучэнняў розных цэркваў, правілы апекі*

*над сіротамі ў духоўным саслоўі датычыліся толькі прадстаўнікоў праваслаўнай царквы і ўніяцкай (да 1839 г.)"*. Але у раздзеле 5.1 (стар. 89–100), дзе непасрэдна разглядаецца ажыццяўленне апекі над сіротамі ў саслоўі духавенства, усё ж акцэнтуецца, што *"практычнае ўвасабленне апекі"* ажыццяўляўлася *"У сувязі з прававымі нормамі Расійскай імперыі..."* (стар. 89). Што датычыць *"спецыфікі канфесійнай палітыкі"* у гэтай справе, то аб ёй не згадваецца і няма аналізу. І не зразумела, аўтар распаўсюджвае сваю выснову на ўсю Расійскую імперыю, або толькі на яе беларускія тэрыторыі?

– Не зусім карэктна, на погляд апанента, ужыванне ў дысертацыйным даследаванні падобных выразаў:

"*На падставе дадзенай справы можна зрабіць пэўныя высновы*" (стар. 90). Але ж для высноў патрабуецца не адна справа, а аналіз шэрагу падобных спраў, верыфікацыя фактычнага матэрыялу і г.д.

Або "*Хлопчыкі-сіроты, па ўсёй верагоднасці, уладкоўваліся ў манастыры больш рэдка, чым дзяўчынкі*". І далей: "*Вылучаныя закамернасці можна разгледзець таксама на прыкладзе...*" (стар. 93). Атрымліваецца, што не ўсебаковы аналіз пэўнай колькасці спраў з выяўленымі ў іх прыкладамі, дае магчымасць вылучаць заканамернасці, а хапае толькі аднаго "*прыклада"*.

– Безумоўна, аўтар грунтоўна працаваў у архівах Беларусі, выявіў вялікую колькасць дакументальнага матэрыялу, што дазволіла правесці цэласнае і выніковае даследаванне па пастаўленай праблеме. Між тым уласны вопыт апанента дазваляе параіць саіскальніку ў працяг дадзенай працы звярнуцца да фондаў Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў (г. Масква), якія ўтрымліваюць вялікі пласт дакументаў з унікальнай інфармацыяй аб палітыцы ўрадаў Кацярыны II і Паўла I па ўключэнню "новадалучаных тэрыторый" у склад Расійскай імперыі. У тым ліку і дакументаў аб правядзенні і характару палітыкі ў сацыяльнай сферы, у прымяненні нормаў Літоўскага статута. Упэўнены таксама, што карысна ў кантэксце тэмы дысертацыі было б звярнуцца да працы У. І. Пічэты "Обзор деятельности 1-го Западного комитета", якая ўпершыню пабачыла свет у 2021 г. і была прымеркавана да 100-годдзя БДУ.

Зробленыя заўвагі і прапановы не змяншаюць каштоўнасці дысертацыйнага даследавання і, як ужо адзначана вышэй, маюць на мэце скіраваць саіскальніка працягнуць працу над тэмай, каб у перспектыве разгледзець некаторыя пытанні больш глыбока.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Навуковая кваліфікацыя аўтара дысертацыі пацвярджаецца зместам дысертацыі і аўтарэфэрата, адпавядае кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук. Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым навуковым даследаваннем, праведзеным на сучасным узроўні. Аўтар прадэманстраваў навыкі даследчыка, які ў стане паставіць і вырашыць навуковыя

задачы. Аналіз дысертацыі, публікацый аўтара, яе ўдзел у навуковых мерапрыемствах даюць магчымасць зрабіць выснову, што кваліфікацыя Кацярыны Рыгораўны Пышкала адпавядае вучонай ступені кандыдадата гістарычных навук.

**Заключэнне.** Дысертацыя **Пышкалы Кацярыны Рыгораўны "Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)"** з'яўляецца самастойным, кваліфікацыйным даследаваннем, якое адпавядае патрабаванням п. 19–20 «Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь" па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Пышкала Кацярына Рыгораўна заслугоўвае прысваення навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

- комплекснае даследаванне арганізацыі сацыяльнай апекі над дзецьмі-сіротамі на працягу гістарычна важнага этапу адаптацыі беларускіх тэрыторый да нормаў і правілаў сацыяльнага жыцця ў Расійскай імперыі;
- раскрыццё працэсу станаўлення і эвалюцыі юрыдычнага забеспячэння саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.;
- выяўленне спецыфікі арганізацыі і практыкі апекі над дзецьмі-сіротамі дваранскага саслоўя;
- вызначэнне характэрных рысаў у саслоўнай апецы над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў;
- выяўленне асаблівасцяў ажыццяўлення апекі ў дачыненні да сірот саслоўя сельскіх абывацеляў;
- устанаўленне адметных рысаў у практыцы апекі над сіротамі духоўнага саслоўя.

Кандыдат гістарычных навук,
прафесар А. А. Яноўскі

БГУ
Исторический факультет
ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ: